✧ Турызм

# Навагрудчына турыстычная

**Важнасць развіцця турызму, які ў свеце даўно прызнаны адной з вядучых і найбольш дынамічных галін эканомікі, не выклікае сумненняў. Вялікі патэнцыял у гэтай сферы мае і Беларусь, спецыфіка турысцкіх рэсурсаў якой характарызуецца наяўнасцю багатага прыроднага патэнцыялу, гістарычна-культурных каштоўнасцей, зручных транспартных сувязей унутры краіны і з сумежнымі краінамі. За апошнія гады ў Беларусі зроблена вельмі шмат для развіцця ўнутранага і знешняга турызму, у тым ліку на Гродзеншчыне і Навагрудчыне. Наш матэрыял аб рэалізацыі чарговага праекта – мясцовай ініцыятывы «Развіваем турызм на Навагрудчыне разам!».**



Рэалізацыя ініцыятывы ажыццяўлялася з чэрвеня па снежань 2017 г. і стала магчымай дзякуючы перамозе ў конкурсе мясцовых ініцыятыў праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Еўрапейскім саюзам і рэалізуецца Праграмай развіцця ААН. Заяўнікам выступіў Навагрудскі дабрачынны фонд «Мы і наш горад». Сума фінансавання склала 24750 еўра. Вынікі падводзім разам з каардынатарам ініцыятывы, інструктарам-метадыстам турысцка-інфармацыйнага цэнтра Наталляй Кавалевіч.



– Сутнасць ініцыятывы выказана рутаў закуплена 10 веласіпедаў, якія турыстычных маршрутаў і ўладкавання веласіпедных маршрутаў. У выніку было распрацавана шэсць турыстычных маршрутаў, з якіх чатыры веласіпедныя, адзін пешы і адзін аўтамабільны. Праведзена маркіроўка чатырох веласіпедных маршрутаў: «Летапісная Літва» (працягласць 50 км), «Зорачка Чарэшлі» (10 км), «Кароль Міндоўг» (2 км) і «Сэрца Гражыны» (15 км).

– Адными з першых па веламаршруце "Зорачка Чарэшлі" праехалі ветэран Вялікай Айчыннай вайны А.М. Сечка і гаспадар аграсядзібы «Чарэшля» М.А. Зуевіч. Іх водгукі былі выключна станоўчымі, – падкрэсліла Наталля. – Ідэю развіцця веласіпедных маршрутаў падтрымаў раённы выканаўчы камітэт. Ужо распрацаваны раённы план мерапрыемстваў на 2018 год па развіцці веласіпедных маршрутаў. Таму можна сказаць, што ў рамках ініцыятывы мы зрабілі добры штуршок да развіцця веласіпеднага руху на Навагрудчыне. Для папулярызацыі створаных веламаршрутаў закуплена 10 веласіпедаў, якія

стваў і эколага-інфармацыйным цэнтры, вывучылі новыя веласіпедныя маршруты і пагледзелі анімацыйныя праграмы. Асаблівую цікавасць ва ўсіх выклікала знаёмства з экспазіцыяй «Яўрэйскае супраціўленне на Навагрудчыне ў гады Халакоста». Завяршыўся дзень у карціннай галерэі К. Качана, дзе адбыўся круглы стол: «Турызм як адзін з галоўных прыярытэтаў тэрытарыяльна-арыентаванага развіцця Навагрудскага раёна» з удзелам прадстаўнікоў райвыканкама і праекта «Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». Удзельнікі прэс-тура былі ўражаны Навагрудчынай і яе турыстычным патэнцыялам. На мой погляд, такія мерапрыемствы варта арганізоўваць штогод.

На думку маёй субяседніцы, больш эфектыўна інфармаваць мясцовае насельніцтва і гасцей нашага рэгіёну аб турыстычных рэсурсах і паслугах, якія прадстаўляюцца, мерапрыемствах дазволіць створаны ў рамках рэалізацыі ініцыятывы сайт «Турызм і адпачынак на Навагрудчыне» (novtour.by).

Я вырашыла пазнаёміцца з гэтым рэсурсам. Адразу зауважу, што змястоўнае напаўненне сайта яшчэ працягваецца, таму не варта абурацца, што інфармацыя асобных раздзелаў няпоўная. Простая структура дазваляе лёгка зарыентавацца ў пошуку не-

✧ З нагоды

**Прафесія выратавальніка ўваходзіць у спіс самых небяспечных прафесій у свеце, яна звязана з рызыкай для жыцця, патрабуе высокага прафесіяналізму і самаахвярнасці. У штодзённых зводках службы МНС толькі лічбы, але за кожнай з іх чыёсьці выратаванае жыццё. 19 студзеня выратавальнікі адзначылі сваё прафесійнае свята. Урачыстасці з гэтай нагоды прайшлі ў актавай зале Навагрудскай дзіцячай школы мастацтваў.**

# Заўсёды на баявым пасту

Павіншаваць ветэранаў і супрацоўнікаў Навагрудскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях прыйшоў **намеснік старшыні райвыканкама Аляксандр Мікалаевіч ГРЫЦ**.

– Сёння мы ўшаноўваем смелых, мужных і высакародных людзей. Усё, што мы ўспрымаем як подзвіг, для вас з'яўляецца звычайнай працай. Дзякуючы вашаму прафесіяналізму і самаахвярнасці, вы хутка прыходзіце на дапамогу і выратоўваеце жыцці людзей, нягледзячы на тое, што рызыкуеце сваім, – адзначыў Аляксандр Мікалаевіч. – Шчырыя словы ўдзячнасці і павагі выказваю вам, паважаныя выратавальнікі, за адказную, нялёгкую працу, добрасумленнае выкананне службовых абавязкаў. Віншую ўсіх вас з прафесійным святам! Няхай вашым добрым спадарожнікам стане ўдача, а працоўныя будні будуць спакойнымі і мірнымі і як мага менш будзе экстрэмальных сітуацый. Ад усёй душы жадаю поспехаў у працы і рэалізацыі запланаванага. Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам, вашым родным і блізкім!

Паважаныя ветэраны пажарнай службы! Шчырая ўдзячнасць вам за шматгадовую бездакорную працу і слаўныя традыцыі.

